**[Васіль** Сушко] // Міёрскія навіны. — 2007. — 13 лют. — С. 1.

Васіль Сушко працуе ў райгазе, займаецца дастаўкай балонаў са звадкаваным газам спажыўцам. Штодзень ён наведвае 40–50 дамоў ва ўсіх населеленых пунктах раёна. Клапоціцца, каб людзі карысталіся вялікай зручнасцю, мелі на кожнай кухні камфорт, які дае блакітнае паліва. Ужо гэта дае падставу для павагі да стараннага працаўніка. А цяпер сказаць добрае слова пра Васіля Сушко трэба і з нагоды таго, што ён з'яўляўся воінам-інтэрнацыяналістам, які ўдзельнічаў у Афганскай вайне. І тады ён быў вадзіцелем, на магутным «Урале» вазіў салдат і спецыяльныя грузы ў Кандагары. Усякае здаралася, аднак цяпер у памяці найбольш яскравыя моманты – спякота, мухі і душманы.